ный ресурс]. – Режим доступа: https://mag.relax.by/city/art/. – Дата доступа: 18.11.2017.

*7.* Премьера: Купаловцы поставили «Саломею» [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://bdg.by/news/. – Дата доступа: 18.11.2017.

*8. Смольскі, Р. Б.* Сучаснае рэжысерскае мастацтва Беларусі: праблемы развіцця ў новых гістарычных вымярэннях / Р. Б. Смольскі // Сучасная беларуская рэжысура: пошукі мастацкай адметнасці ў кантэксце традыцый сучаснага еўрапейскага тэатра : зб. матэр. Міжнар. навук.-творч. канф. (Гродна, 16–17 кастр. 1997 г.). – Мінск, 1998. – С. 24–40.

*9.* Спектакль «Хам» возвращается на сцену Купаловского [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://news.tut.by/culture/. – Дата доступа: 18.11.2017.

*10.* Театр: темная сторона света [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://vk.com/away. – Дата доступа: 18.11.2017.

***А. І. Бабко,***
*кандыдат філасофскіх навук, дацэнт,*
*дацэнт кафедры філасофіі*
*і метадалогіі гуманітарных навук*
*Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта*
*культуры і мастацтваў*

# УЗАЕМАДЗЕЯННЕ ФІЛАСОФСКІХ ТРАДЫЦЫЙ У КАНТЭКСЦЕ ДЫЯЛОГУ КУЛЬТУР

Людзі па-рознаму бачаць свет, па-рознаму інтэрпрэтуюць падзеі ў ім, па-рознаму выбудоўваюць свае жыццёвыя стратэгіі. Разам з тым іх светапоглядныя арыенціры выяўляюць тую ці іншую ступень блізкасці, а ў канчатковым выніку, на найглыбейшым узроўні ўласцівай ім іерархічнай структуры, яны факусуюцца ў агульначалавечых ідэалах і каштоўнасцях. Глыбокая агульначалавечая падстава розных тыпаў светабачання не выключае, аднак, магчымасці разгортвання іх рознасці да ўзроўню антаганістычнай, абвостранай супярэчнасці, драматычнага канфлікту, адкрытага варагавання. І гістарычнае мінулае, і сучаснасць пераканальна пацвярджаюць (на жаль) правамернасць дадзенай тэзы.

Неабходна адзначыць, што даведзенае вышэй мае моц і ў дачыненні да культуры ўвогуле, і да разгортвання філасофскай рэфлексіі. Тая акалічнасць, што момант разнастайнасці, якая

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

характарызуецца істотным унутраным адзінствам, выступае як грунтоўна важны ў кантэксце культуратворчых працэсаў і з пункту гледжання развіцця філасофскай думкі не выклікае ніякіх сумненняў. Несумненна і тое, што ні міжкультурны дыялог, ні ўзаемадзеянні філасофскіх кірункаў зусім не пазбаўлены драматычных калізій, сур'ёзных небяспек або трагічных няўдач. Таму пры ўсёй натуральнасці і абгрунтаванасці высновы, згодна з якой і вялікі міжкультурны полілог, і ўзаемадзеянне філасофскіх традыцый з'яўляюцца неад'емнымі фактарамі інтэнсіўных і выніковых духоўных пошукаў чалавека і чалавецтва, паспяховасці іх духоўнай працы, заканамерна паўстае пытанне аб характары і механізмах здзяйснення дыялагічных стасункаў у культуры ўвогуле і ў яе філасофскім сегменце, а таксама аб шляхах і метадах метанакіраванага ўплыву на адпаведныя працэсы. Тэза, паводле якой згаданыя стасункі і ў агульнакультурным плане, і з пункту гледжання разгортвання філасофскіх пошукаў вядуць да ўзаемаўзбагачэння ўзаемадзейных ідэй, канцэпцый і праектаў, выглядае банальна праўдзівай. Узаемадачыненні культурных і філасофскіх традыцый, аднак, не заўжды ўвасабляюцца ў форме раўнапраўнага плённага дыялогу.

Сярод уласцівых як міжкультурным узаемадзеянням, так і ўзаемінам філасофскіх ідэй фактараў, здольных ператварыцца ў перашкоду для іх дыялагічнага ўвасаблення, неабходна адзначыць момант спаборнасці – надзвычай важны для іх дынамічнага разгортвання, але разам з тым і надзвычай небяспечны. Сапраўды, дух і ўмовы спаборніцтва (у немалой ступені дзякуючы сваёй эмацыйнай насычанасці) могуць выклікаць настрой думак, для якога характэрна прынцыповае непрыманне іншага пункту погляду, нецярпімасць, дыскрымінацыйныя практыкі і – у канчатковым выніку – гвалтоўныя дзеянні, скіраваныя супраць носьбітаў іншых норм, ідэалаў і прынцыпаў.

Надзвычай выразна гэты драматычны аспект міжкультурных узаемадзеянняў і ўзаемадачыненняў адпаведных стратэгій філасофскіх пошукаў выявіўся ў кантэксце стасункаў усходняга і заходняга абсягаў чалавечай цывілізацыі. Дамінаванне заходняга грамадства і ў эканамічным, і ў культурным жыцці чалавецтва, якое ў найвышэйшай ступені выразна выявілася ў каланіяльных заваёвах і практыках, зусім не адышло ў нябыт

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

са знікненнем адкрытых формаў каланіялізму. У кантэксце ўзаемадачыненняў філасофскіх традыцый таксама можна канстатаваць перавагу заходняй філасофскай думкі, што адчуваецца і ў нашым культурным асяродку. Удзельная вага вучэбнага матэрыялу, прысвечанага заходняй філасофіі, значна пераўзыходзіць у практыках выкладання філасофскіх дысцыплін у нашых універсітэтах той аб’ём вучэбнага часу, што адводзіцца на вывучэнне пазаеўрапейскіх філасофскіх канцэпцый. Разгляд усходняй філасофскай думкі засяроджваецца, як правіла, на класічных кітайскіх і індыйскіх сістэмах, а таксама на сярэднявечнай ісламска-арабскай філасофіі і фактычна абмяжоўваецца імі: сучасныя працэсы, што адбываюцца ў філасофскіх сегментах культур, што не належаць да заходняга грамадства, застаюцца ў асноўным па-за ўвагай.

Як рэакцыя на такі стан спраў у самім заходнім культурным абшары (найперш у нямецкамоўным яго сегменце) у канцы дваццатага стагоддзя паўстаў філасофскі кірунак, які атрымаў назву «міжкультурная філасофія». Яго прадстаўнікі бачаць сваю задачу ў актыўным спрыянні інтэнсіўнаму і плённаму дыялогу культурных і адпаведных філасофскіх традыцый. Яны лічаць, што ў якасці найважнейшай мэты раўнапраўных міжкультурных стасункаў павінна фігураваць паразуменне носьбітаў розных поглядаў і ідэй адносна шляхоў і метадаў вырашэння найважнейшых праблем, што стаяць перад чалавекам і чалавецтвам. Пры гэтым у першую чаргу гаворка вядзецца пра пытанні “сэнсавага” ўзроўню і характару (пытанні, звязаныя з сэнсам чалавечага жыцця, з духоўным прызначэннем чалавека і чалавецтва, з перадумовамі яго здзяйснення, з падставамі паспяховай рэалізацыі надзвычай складанага і адкрытага ў сваіх выніках праекта, якім з’яўляецца згаданае жыццё) [4, с. 127–129].

Прыхільнікі міжкультурнага філасофскага праекта ясна ўсведамляюць, што ні прызнанне адзінага, усёпаглынальнага, інтэгратыўнага або экспансіўнага цэнтра, які задаваў бы развіццё чалавечай культуры, ні сепаратысцкія стратэгіі культурнага будаўніцтва не адпавядаюць патрабаванням плённага палілогу культур [3, с. 71–72]. Таму яны, з аднаго боку, указваюць на неабходнасць пераадолення «еўрацэнтрызму», што дамінуе ў заходняй філасофскай думцы, а з іншага – крытычна

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ацэньваюць «посткаланіяльныя» канцэпцыі, якія радыкальна адмяжоўваюцца ад заходняй філасофіі, разглядаючы ўсе без выключэння яе кірункі як сродак, пры дапамозе якога заходняе грамадства імкнецца сцвердзіць грунтоўна важны для яго прынцып (эканамічнай) рацыянальнасці ў глабальным маштабе [4, с. 135].

Памкненне пераадолець «еўрацэнтрычную» скіраванасць заходняй філасофскай думкі, якое істотным чынам характарызуе міжкультурны філасофскі дыскурс, падштурхнула яго ўдзельнікаў да правядзення інтэнсіўных кампаратыўных штудый. Надзвычай важна, што згаданыя штудыі разглядаюцца імі не як самамэта, а як сродак для запачаткавання і разгортвання плённага дыялогу паміж прадстаўнікамі розных культур і філасофскіх кірункаў. Няўхільна кіруючыся прынцыпам раўнапраўнасці ўсіх бакоў, задзейнічаных у адпаведных стасунках, гэтыя даследчыкі імкнуцца тактоўна і ўважліва ставіцца да пазаеўрапейскіх філасофскіх традыцый.

Найважнейшым з дасягнутых прыхільнікамі міжкультурнага філасофскага праекта вынікаў правамерна лічыць пераасэнсаванне ўласцівага заходняй культуры бачання сутнасці, характару і найважнейшых задач філасофскага мыслення, а таксама яго ўзаемадачыненняў з іншымі духоўнымі феноменамі, у першую чаргу з навукай і рэлігіяй. Гэта выявілася найперш у іх закліку адмовіцца ад аднабаковай арыентацыі філасофскага пошуку на пазнавальныя стандарты, якія грунтуюцца на прынцыпах навуковай рацыянальнасці і якія дамінуюць у заходняй культуры (згаданае дамінаванне, аднак, цалкам справядліва разглядаецца як адноснае). Згаданыя заклікі суправаджаюцца памкненнем пераадкрыць і нанова засвоіць высокі духоўны патэнцыял рэлігійна-міфічнага светабачання, звязаны з яго засяроджанасцю на вечных, «сэнсавых» пытаннях, якія губляюцца ў заходніх філасофскіх кірунках, сцэнтраваных на моўна-лагічным аналізе навуковых і пазанавуковых дыскурсаў [2, с. 13–14].

У дадзеным кантэксце ўсходнія філасофскія сістэмы, для якіх блізкасць да рэлігіі і міфа з'яўляецца ў найвышэйшай ступені характэрнай, паўстаюць у новым святле – не як суразмоўцы, якім даецца слова і якія паблажліва выслухоўваюцца

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

дзеля высокіх этычных прынцыпаў, а як носьбіты важных і значных поглядаў, вывучэнне якіх можа і павінна ўзбагаціць уласныя ідэі ва ўсёй іх адметнасці (ад якой ніхто і ні ў якім разе не заклікае адмаўляцца).

Неабходна адзначыць, што ў беларускім культурным і філасофскім кантэксце шмат у чым блізкую да міжкультурнага філасофскага праекта пазіцыю займаў Мікола Крукоўскі (і гэтая пазіцыя – дзякуючы яе пантэістычным падставам – можа быць эфектыўна выкарыстана ў кантэксце абгрунтавання згаданага праекта). Надзвычай высока ацэньваючы духоўны патэнцыял рэлігіі [1, с. 44], ён аддае належнае ўсходнім філасофскім сістэмам [1, с. 102, 118, 121] і крытыкуе скептычна-ірацыянальную скіраванасць сучаснай заходняй філасофскай думкі [1, с. 46, 58]. Падкрэсліваючы нацыянальны характар філасофскіх ідэй [1, с. 44], ён зусім не адмаўляе наяўнасці ўзаемадзеяння паміж філасофскімі традыцыямі і сам імкнецца паспрыяць плённаму дыялогу беларускай філасофіі з філасофскай рэфлексіяй іншых народаў (лепшымі, з яго пункту гледжання, яе ўвасабленнямі).

Такім чынам, у багатай палітры філасофскіх кірункаў існуюць падыходы, якія свядома і актыўна прасоўваюць ідэю раўнапраўнага дыялогу розных культурных і філасофскіх традыцый. Яны заслугоўваюць самай высокай ацэнкі, што не азначае надання ім імунітэту ад магчымай крытыкі (якая павінна грунтавацца, безумоўна, на сур'ёзным іх аналізе). У дачыненні да міжкультурнага філасофскага праекта ў крытычным плане можна заўважыць, што сапраўдная філасофія заўжды выступае у адзінстве нацыянальнага, міжкультурнага і агульнакультурнага (агульначалавечага) пачаткаў, і таму акцэнтуацыя пэўнага з іх не зусім адпавядае яе існасці. Тым не менш згаданы праект выяўляе грунтоўны гуманістычны патэнцыял, што цалкам апраўдвае яго існаванне.


1. *Крукоўскі, М. І.* Бляск і трагедыя ідэалу / М. І. Крукоўскі. – Мінск : Беларускі кнігазбор, 2004. – 352 с.

2. *Bickmann, C.* Vorwort. Einführung in die Themenstellung / C. Bickmann // Religion und Philosophie im Widerstreit? Internationaler Kongress an der Universität zu Köln, 13. – 16. Juli 2006 / C. Bickmann, M. Witz, H.-J. Scheidgen (Hrsg.). – Nordhausen, 2008. – S. 11–19.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

3. *Gmainer-Pranzl, F.* Verständigung – Anerkennung – Identität. Zur kommunikations theoretischen Rekonstruktion von «Kultur» bei Jürgen Habermas / F. Gmainer-Pranzl // Polylog. – 2013. – № 29. – S. 67–84.
4. *Schmied-Kowarzik, W.* Thesen zum interkulturellen Selbstverständnis der Philosophie / W. Schmied-Kowarzik // Polylog. – 2016. – № 35. – S. 123–143.

***Ю. Г. Балодис,***
*кандидат культурологии, доцент,*
*доцент кафедры менеджмента*
*социально-культурной деятельности*
*Белорусского государственного*
*университета культуры и искусств*

# АКТУАЛЬНЫЕ ТЕНДЕНЦИИ В ОРГАНИЗАЦИИ ГОРОДСКИХ ПРАЗДНИКОВ

Большинство ученых в качестве основных процессов современности называют глобализацию, информатизацию, виртуализацию, массификацию, коммерциализацию и визуализацию культуры [4, с. 20–22]. Под влиянием этих тенденций в обществе произошел ряд положительных и отрицательных трансформаций. Изменение характера развития современного общества и его культуры обусловили соответствующие изменения в организации и проведении массовых городских праздников за рубежом и в нашей стране. Эти изменения затронули и те города, где массовые городские праздники проводятся относительно недавно (1980–2017), и те, которые имеют собственную многолетнюю «праздничную» историю [1].

Площадные мероприятия на регулярной основе стали проводиться в Европе, начиная со Средневековья. Прежде их основное назначение заключалось в демонстрации мощи населенного пункта или государства в целом, а также в консолидации общества. В настоящее время городские праздники за рубежом рассматриваются как важная составляющая «гения места» и туристический фактор. Затруднительно, например, ощутить в полной мере «дух города» в Венеции или Рио-де-Жанейро без их всемирно известных карнавалов. Среди туристических центров можно назвать города и городки, ставшие популярными у туристов исключительно из-за регулярно проводимых там праздничных мероприятий.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ